Дзяніс БАРСУКОЎ,
дырэктар мастацкай галерэі
"Універсітэт культуры",
фота Віктара Кавалёва

# Наш «Kodex» убачаць у Венецыі

Сёлета **Рэспубліка Беларусь бярэ ўдзел у** Венецыянскай **біенале — найстарэйшым** і **самым аўтарытэтным форуме сусветнага сучаснага мастадтва. Прызначэнне гэтай маштабнай міжнароднай выстаўкі, якая нраводзіцца з 1895 года, — прадставіць найбольш значныя з'явы ў сучасным мастацтве розных краін. У Венецыянскай біенале ўдзельнічае больш як 70 краін, сярод якіх Італія, Вялікабрытанія, ЗША, Францыя, Нідэрланды, Германія, Японія, Аўстрыя, Швейцарыя, Расія, Украіна.**



Па ініцыятыюе і пад эгідай Міністэрства культуры Беларусі на 54-й Міжнароднай высгаўцы сучаснага масгаціва —"La Biennale di Venezia" — адкрыецца нацыянальны Беларускі павільен, у якім з чэрвеня па лістапад 2011 года будзе прадстаўлены праект "Kodex", шго аб'ядндае прадстаўнікоў сучаснага беларускага мастацтва: Артура Клінава, Віктара Пятрова, Кансганціна Касцючэнку, Юрыя Алісевіча, Дзяніса Скварцова Паводле слоў куратара праекта Міхаіла Баразны, Беларускі павільён на Венецыянскай біенале прадставіць не камерцыйна паспяховае, а менавіта інтэлектуальнае мастацтва сучаснай Беларусі

Праект "Kodex" у цэльм можна назваць графічным. Кодэкс (ад ням. codex і лац. codex — кніга) азначае старажытную форму кнігі са старонкамі, што змяніла нязручныя скруткі. Праект жа ўяўляе сабой сучасную інтэрпрэтацыю афармлення тэксту. Чорна-белая графіка Юрыя Алісевіча — манахромная аснова ўсёй кампазіцыі, мае ў праекце значэнне ўласна тэксту (чорньм літары на белай паперы), які аздабляецца колерам — работамі іншых удзельнікаў.

Віктар Пятроў, заснавальнік і арганізатар фестывалю перформансу "Навінкі", прадставіць графічнае аздабленне ўласнага тэксту і шэраг перформансаў. Скульптура Канстанціна Касцючэнкі надасць праекту глыбіню і матэрыяльнасць. Творы гэтага аўтара адлюстроўваюць уплыў графічнасці на аб емна-прасторавае мысленне. Аб'екты мастака, архітэктара, літаратара Артура Клінава, створаныя з традыцыйнага беларускага матэрыялу — саломы, з'яўляюцца вынікам творчай перапрацоўкі класічных сюжэтаў, архітэктурных помнікаў, надання ім цалкам іншага сэнсавага напаўнення. Рух і экспрэсія відэаарту рэжысёра і графіка Дзяніса Скварцова з'яўляюцца лагічным завяршэннем працэсу афармлення актуальнага ілюмінаванага тэксту сучаснымі сродкамі.

Праект "Kodex" адлюстроўвае характар развіцця беларускага мастацтва апошніх гадоў: традыцыйная манахромная графічнасць узбагачаецца рухам цела, гукам, святлом, сучаснай аб'ёмнай пластыкай. Мяркую, што ідэйная прастора, увасобленая ў праекце, годна прадставіць сучаснае беларускае мастацтва на прэстыжным міжнародным форуме ў Венецыі

***На здымку: фрагмент кампазіцыі Артура Клінава "Патаемнае жыццё саломы".***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ